**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**народны вакальны ансамбль «Добры вечар»**
**ДУК «Рагачоўскі гарадскі дом культуры»**

Вакальны ансамбль «Добры вечар» ДУК «Рагачоўскі гарадскі дом культуры» быў створаны ў 1988 годзе, яго заснавальнік і нязменны кіраўнік Зайцаў Міхаіл Фёдаравіч. У 1998 годзе калектыву было прысвоена найменне «народны аматарскі калектыў», а ў 2010 годзе народны вакальны ансамбль «Добры вечар» атрымаў ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны вакальны ансамбль «Добры вечар» з'яўляецца музычнай візіткай раёна. Рэпертуар складаецца з народных песень, аўтэнтычнага фальклору Рагачоўшчыны ў апрацоўцы кіраўніка ансамбля Зайцава М.Ф. Усяго ў рэпертуары звыш 40 нумароў. Выбар музычнай праграмы залежыць ад тэматыкі і накіраванасці канцэрта.

Рэпертуар вакальнага ансамбля забяспечвае паўнавартаснае музычнае развіццё кожнага ўдзельніка ансамбля. Калектыў вылучаецца высокім мастацкім і выканальніцкім узроўнем, артыстызмам і сцэнічным майстэрствам. Кожны нумар калектыву мае сваю рэжыссуру, творчы вобраз. Кампазіцыі адрозніваюцца па тэматыцы, складанасці, але заўсёды своеасаблівыя і цікавыя, фарміруюць цэластнасць канцэртнай праграмы.

Наяўнасць музычнай падрыхтоўкі ўдзельнікаў вылучае ансамбль высокім выканаўчым узроўнем. Яны не толькі шматгалосна спяваюць, але і іграюць на музычных інструментах¸ якія выкарыстоўваюцца ў якасці акампанементу (скрыпка, дудачкі, трашчоткі, баян). Усе тэмбры ў ансамблі зліваюцца адзін з адным, ствараючы гарманічнае гучанне калектыву.

«Добры вечар» вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. Ён выступае перад жыхарамі вобласці ў сельскіх клубных установах раёна, на гарадскіх пляцоўках. У канцэртных выступленнях калектыў выкарыстоўвае сучасную гукаўзмацняльную апаратуру гарадскога дома культуры г. Рагачова.



